# Дэлегацыя Саюзу савецкіх пісьменьнікаў у тав. Галадзеда

МЕНСК, 13, (БЕЛТА). У сувязі з 50-годзьдзем са дня нараджэньня народнага поэта БССР Янкі Купалы, дэлегацыя саюзу савецкіх пісьменьнікаў Беларусі ў складзе: юбіляра—Янкі Купалы, народнага поэты Якуба Коласа і членаў оргкамітэту ССПБ т. т. Лыньковa і Андрэя Александровіча 11 верасьня наведала старшыню СНК БССР тав. Галадзеда і мела з ім працяжную гутарку.

У гутарцы прымаў удзел першы сакратар ЦК КП(б)Б т. Гікало.

Вітаючы юбіляра Янку Купала з яго 50-годзьдзем, т. т. Галадзед і Гікало ў 2-гадзіннай гутарцы закранулі рад важнейшых пытаньняў нацыянальна-культурнага будаўніцтва БССР.

Асабліва ажыўлена гутарка завязалася вакол пытаньняў бурнага разьвіцьця літаратуры і мастацтва на фоне агульных вялізарнейшых дасягненьняў, якіх БССР, пад кіраўніцтвам КП(б)Б. дабілася на ўсіх вучастках соцыялістычнага будаўніцтва, і задач савецкіх пісьменьнікаў і працаўнікоў мастацтва ў сувязі з пастановай ЦК УсеКП(б) аб перабудове літаратурных організацый.

У гутарцы з дэлегацыяй т. т. Галадзед і Гікало адзначалі вялікія заслугі Янкі Купалы перад савецкай літаратурай і мастацтвам БССР, не гледзячы на яго некаторыя памылкі ў мынулым.

Старшыня СНК тав. Галадзед асабліва цікавіўся пытаньнямі культурнага і мастацкага росту маладых кадраў на літаратурным і тэатральным франтох, узаемаадносінамі са „старыкамі“, матар‘яльна-бытавым становішчам-савецкіх пісьменьнікаў, іх творчай работай, разгортваньнем самакрытыкі ўнутры саюзу і г. д.

— Учора,—сказаў у гутарцы Янка Купала,—на масавым урачыстым вечары, прысьвечаным майму 50-годзьдзю я з вялікай для мяне радасьцю яшчэ лішні раз пераканаўся аб тэй вялікай увазе, якую мне аддае партыя, урад і ўся савецкая грамадзкасьць БССР. Тое, што я бачыў учора, уліло ў мяне сьвежы струмень бадзёрасьці і ўпэўненасьці для таго, каб на астатнім маім жыцьцёвым шляху працаваць і змагацца пад сьцягам комуністычнай партыі, партыі за канчатковае соцыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўных.

Пісьменьнікі т. т. Лынькоў і Андрэй Александровіч азнаёмілі т. т. Галадзеда і Гікало з творчай дзейнасьцю савецкіх пісьменьнікаў БССР у сувязі з надыходзячай 15-й гадавінай Кастрычніка, а таксама з задачамі, якія стаяць перад саюзам савецкіх пісьменьнікаў Беларусі напярэдадні ўсебеларускага і ўсесаюзнага зьездаў саюзу савецкіх пісьменьнікаў.

Зьвяртаючыся да юбіляра і дэлегацыі, сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гікало сказаў:

„Вы павінны разглядаць сябе, як важную частку цэлага організму ўсёй нашай пролетарскай дзяржавы, як неадлучную частку ўсяго нашага магутнага мэханізму соцыялістычнага будаўніцтва, тады зможаце з большымі посьпехамі адлюстроўваць пафос нашага будаўніцтва, зможаце паказваць гэроіку нашых соцыялістычных будняў, а з боку партыі і савецкай улады вам будзе аказана максымальная дапамога і падтрыманьне».

Разьвітваючыся з дэлегацыяй, т. т. Галадзед і Гікало падкрэсьлілі, што зараз, напярэдадні 15-й гадавіны Кастрычніка, вялікія абавязкі ляжаць на саюзе савецкіх пісьменьнікаў БССР. Гэтыя абавязкі патрабуюць ад саюзу хутчэйшага завяршэньня перабудовы сваіх радоў, больш дружнай работы паміж пісьменьніцкай моладзьдзю і «старыкамі», пераняцьця ад іх лепшага вопыту і майстэрства, а пісьменьнікі-«старыкі» павінны пераняць ад маладых іх энтузіязм і бадзёрасьць і разам весьці барацьбу за ленінскую чыстату ідэолёгічнага і літаратурна-мастацкага фронту, змагацца з рэшткамі нацыяналістычных элемэнтаў. Адначасова з гэтым неабходна шырока разгортваць сярод пісьменьнікаў бальшавіцкую самакрытыку. Усё гэта дапаможа савецкім пісьменьнікам БССР у іх адказнай справе —тварыць магнітабуды мастацтва, вартыя нашай вялікай гістарычнай эпохі

АДРАС РЭДАКЦЫІ: Менск, вул. Карла Маркса 38. Тэл.: рэдактара—7-25, сэкратарыят—12-19
АДРАС КАНТОРЫ: Комсамольская вул., 25. Тэлефон—9-03. Год выданьня XII

Друкарня імя Сталіна.